УДК 39:615.89 (282.247.23) (161.3)

# УПЛЫЎ ЗНЕШНЯГА АСЯРОДЦЗЯ НА СІСТЭМУ НАРОДНАЙ МЕДЫЦЫНЫ БЕЛАРУСАЎ ПАДЗВІННЯ

*У. С. ФІЛІПЕНКА*
*(Полацкі дзяржаўны універсітэт)*

*Разглядаецца ўплыў некоторых природных і культурных фактараў на народную медицину беларусаў Падзвіння. На базе этнаграфічных крыніц, сучасных даследаванняў і ўласных палявых матэрыялаў аўтар прыходзіць да высновы, што шматлікія ўзвышшы, камяні, водныя аб'екты, а таксама бытаванне ў рэгіёне лазні абумоўліваюць адметнасць народнамедыцынскіх уяўленняў і лекавальных практык. Гэта дазваляе казаць пра народную медицину беларусаў Падзвіння як пра адносна самастойную сістэму.*

Беларускае Падзвінне - гістарычна-этнаграфічны рэгіён, чыя адметнасць яскрава праяўляецца ў многіх сферах матэрыяльнай і духоўнай культуры. Шэраг аб’ектыўных даных дазваляе меркаваць, што яго будуць вылучаць асаблівасці і ў сферы народнай медыцыны.

На працягу вось ужо болын за паўтара стагоддзя грунтоўнага этнаграфічнага вывучэння Падзвіння быў назапашаны багацейшы матэрыял па народнай медыцыне мясцо вага беларускага насельніцтва. Тым не менш ані ў працах А.Я. Багдановіча, Ф.Л. Вярэнькі, Я.А. Ляцкага, М.Я. Нікіфароўскага, Е.Р. Раманава, Я.К. Тышкевіча, А.А. Шлюбскага, П.В. Шэйна (тым больш у апавяданнях Я. Баршчэўскага), ані ў работах пазнейшых этнографаў, этнолагаў і фалькларыстаў праблема рэгіянальных асаблівасцяў традыцыйных медыцынскіх уяўленняў і лекавальнай практыкі Падзвіння на агульнабеларускім фоне не знайшла належнага адлюстравання.

Падобная сітуацыя склалася і адносна іншых беларускіх рэгіёнаў. І тэта не павінна здзіўляць. У XIX - пачатку XX ст. піянеры этнаграфічнага вывучэння Беларусі пераважна прысвячалі сваю дзейнасць збору фактычнага матэрыялу. У савецкі перыяд даследаванне беларускай народнай медыцыны паступова звузілася да разгляду яе рацыянальных кампанентаў, а таму, па сутнасці, перайшло ў сферу інтарэсаў прадстаўнікоў прыродазнаўчых дысцыплін. Да прыкладу, аўтары дзвюх асноўных дысертацыйных работ таго часу па тэме «біёлаг» (Николаева В.Г. Материалы к исследованию лекарственных растений народной медицины Белоруссии: Автореф. дис. ... канд. біял. навук. - Мн., 1964) і экс-ветэрынар (Минько Л.И. Белорусская народная медицина и вред знахарства: Автореф. дне. ... канд. біял. навук. - Мн., 1965). Сёння этнолагі ў сваіх даследаваннях спрабуюць на падставе сучасных навуковых падыходаў прадставіць уяўленні і практычную дзейнасць беларусаў у галіне народнай медыцыны на шырокім агульнабеларускім, усходне-, агульнаславянскім і нават індаеўрапейскім матэрыяле.

Народная медыцына любой этнічнай супольнасці можа быць разгледжана як складаная этнакультурная сістэма, якой уласціва прынцыповае адзінства ўнутранай канфігурацыі і базавых характарыстык складовых элементаў. Унутрысістэмныя універсаліі (але рэдка канстантныя параметры) дазваляюць казаць асобна пра народную медыцыну славян, усходняга славянства, беларусаў і г.д. Аб’ектыўная ж унутраная неаднароднасць кожнай з гэтых сістэм забяспечвае магчымасць далейшага іх драбнення: з славянскай, напрыклад, натуральным чынам вылучаецца ўсходнеславянская, а з усходнеславянскай - беларуская.

Але наколькі неаднароднай з’яўляецца сістэма беларускай народнай медыцыны? Як ужо адзначалася, узровень распрацаванасці азначанай праблемы ў айчыннай этналогіі стварае аб’ектыўныя цяжкасці для высвятлення рэгіянапьнай спецыфікі непасрэдна на ўзроўні падсістэм - народнамедыцынскай свядомасці (пачуццёвых вобразаў, паняццяў, ацэначных меркаванняў ды інш.), сродкаў (расліннага, жывёльнага, мінеральнага паходжання ды інш.) і прыёмаў захавання і ўмацавання здароўя людзей, а таксама папярэджання і лекавання хваробаў (магічных, рацыянальных, магічна-рацыянальных), спецыяльных інстытуцыяў (сям’і, грамады, знахарства, чарадзейства). (Прапанаваная аўтарам структура сістэмы народнай медыцыны не прэтэндуе на дасканаласць - даследаванне гэтага пытання павінна стаць прадметам спецыяльнай увагі. Яна выконвае тут не столькі строга тэарэтычную, колькі дапаможную ілюстрацыйную функцыю).

Для пачатку зробім дапушчэнне, што народная медыцына беларусаў Падзвіння сапраўды з’яўляецца адносна самастойнай сістэмай. Потым разгледзім уплыў на яе шэрагу адметных рэгіянальных агентаў знешняга асяроддзя і выявім непасрэдныя наступствы гэтага ўздзеяння. Прычым знешнее асяроддзе ў духу сістэмнага падыходу разумеецца як любыя фактары, вонкавыя для сістэмы [1, с. 28], а таму пераеягае рамкі навакольнага (прыроднага) асяроддзя, рэпрэзентуючы як поле прыроды, гэтак і поле культуры.

* Артыкул выкананы ў рамках праекта Г04М-209 «Народная медыцына беларусаў Падзвіння: этнакультурны аспект», які ажыццяўляецца пры падтрымцы Беларускага рэспубліканскага фонду фундаментальных даследаванняў.

На наш погляд, той факт, што як і любыя іншыя сістэмы, этнічныя супольнасці актыўна ўзаемадзейнічаюць са сваім асяроддзем, у першую чаргу прасторай свайго пражывання, не патрабуе асаблівых каментарыяў. 1 хоць адсутнасць паміж этнасам і асяроддзем «жорсткай» і аўтаматычнай узаемасувязі таксама не выклікае сумнення, характэрныя асаблівасці прыродна-геаграфічнага асяроддзя аказваюць істотнае ўздзеянне на матэрыяльную і духоўную культуру. У выніку праз механізмы адаптацыі этнічныя супольнасці прыстасоўваюцца да сваёй прыроднай «нішы» [2, с. 212-215].

Што ж можа сведчыць пра адметнасць знешняга асяроддзя бытавання народнай медыцыны беларусаў Падзвіння?

Падзвінне мае выразныя прыродна-геаграфічныя, у прыватнасці, ландшафтныя асаблівасці. Па-першае, рэгіён амаль цалкам упісваецца ў межы геамарфалагічнай вобласці Беларускага Паазер'я [3, с. 62]. Ён характарызуецца значным узроўнем вертыкальнай расчлянёнасці (розніца вышэйшых і ніжэйшых абсалютных адзнак, у метрах на кіламетр квадратны) і высокім паказчыкам стромкасці схілаў рэльефу (агульны нахіл паверхні, у градусах) [4, с. 64 - 65]. Іншымі словамі, Падзвінне надзвычай багатае на узвышшы, вядомае традыцыйнай беларускай культуры як «горы».

Па-другое, як рэгіён, чые паўднёвыя рубяжы прыблізна адпавядаюць паўднёвай мяжы апошняга (вюрмскага) ледавіковага покрыва [5, с. 57]. Падзвінне апярэджвае іншыя рэгіёны Беларусі па завалуненасці. Валуноў тут не проста болей, яны яшчэ і большыя [6, с. 62, 175].

Апроч таго, Падзвінне складае адноснае адзінства па характары воднага балансу і гідралагічнага рэжыму паверхневых і грунтавых вод (Заходнедзвінскі гідралагічны раён). Ён характарызуецца багаццем водных аб'ектаў - рэк, азёр, балот, крыніц і значнай гушчынёй рачной сеткі [7, с. 84].

Велізарная колькасць узвышшаў, камянёў і водных аб'ектаў не магла не адбіцца на матэрыяльнай і духоўнай культуры беларусаў Падзвіння. У рамках міфапаэтычнай карціны свету «прыродныя локусы (возера, крыніца, камень, пагорак і інш.), адзначаныя іерафаніяй (праявай сакральнага) выступаюць як святыя кропкі прасторы і адначасова як рытуальны цэнтр «свайго» свету, дзе магчыма дзейсная камунікацыя чалавека (калектыву) з вышэйшымі «боскімі» сіламі» [8, с. 7]. Адна з важнейшых функцый гэтых сакральных цэнтраў - «прошчаў» - была і лекавая.

У беларускіх замовах, да прыкладу, камень «выступае як сімвалічны цэнтр сусвету, "падмурак" Сусветнага дрэва, дзе знаходзяцца прычына хваробы або ўмовы (прасторавыя і персанальныя) яе ліквідацыі; як своеасаблівы "адрас" на мяжы іншасвету, куды накіроўваецца (вяртаецца) немач і адкуль чакаецца дапамога...» [9, с. 221] («Ідзі, Вольгіна скула, на ніцыя лозы, сухія балоты, пад чорныя калоды, на чорнае карэнне, на шэрае каменне, каменне гладаць, ваду хлібаць...»; «На сінім моры, ва кеяне ляжыць бел камень, натым камні сядзелі тры панны Ганны, красны шоўк металі кроў астанаўлялі» [10, с. 210, 154]). Асаблівыя магічныя ўласцівасці згодна народным уяўленням былі сканцэнтраваныя ў каменях незвычайнай формы і памераў. Многія з іх лічыліся гаючымі. У адных выпадках для лекавых мэтаў выкарыстоўваліся кавалачкі каменя, стоўчаныя ў парашок («Шалёны камень» у в. Грыдзюшкі, Глыбоцкага р-на) [11, с. 118], у другіх - дажджавая вада са «слядкоў» (камень-следавік ля в. Прудзіны, Бешанковіцкага р-на) [12, с. 45], у трэціх - мох з каменя, а да некаторых дастаткова было датыкнуцца. Спектр хвароб, якія згодна з народнымі ўяўленнямі вылечваліся з дапамогаю падобных камянёў, быў вельмі шырокім [13, с. 16, 32].

Не заўжды на Падзвінні лічылі гаючым нейкі канкрэтны камень. Мачыцца на любы з іх (напэўна, на досыць вяЛікі) - прафілактычны захад супраць пякоткі і сродак ад энурэзу [14, с. 159, 172]. На камяні замаўляўся зубны боль, каб зуб анямеў [10, с. 478]. Прычым, калі прыняць да ўвагі той факт, што вельмі часта ў рэгіёне яго выкарыстоўвалі замест ганку [15, с. 5 - 6], даступнасць памянёных сродкаў выглядае яшчэ большай. Дзейснасць жа гэтых магічных практык магла ў народным уяўленні яшчэ больш узрастаць з прычыны памежнага - паміж сваім (хата) і чужым (навакольным) светам - становішча «каменя-ганку».
У дадзеным выпадку ён станавіўся тоесным парогу, чыё значэнне ў знахарскіх практыках добра вядома [16, с. 366-367].

На Падзвінні зафіксавана вельмі багата звестак і пра выкарыстанне больш дробных камянёў. На лёгкія і ўдалыя роды каменьчыкам з мышынага кубла раілі церці жывот цяжарнай [17, с. 9], а нованароджаным хлопчыкам, каб раслі моцнымі, камянямі перабівалі пупавіну [18, с. 89, 91]. Калі ж малое доўга не ходзіць, «маці прыносіць у падале кашулі з гарнец гладышаў з перасохлай ручаіны і, раскідаўшы іх па хаце на прасторы трох крокаў, водзіць дзіця па ім, "покуліцька яно ні змардуіцца"» [17, с. 29]. **Тут** камяні павінны былі не проста перадаць малому трываласць у нагах. У якасці агента стыхіі зямлі («...Кожны камень, перапалены на лазеннай або ёўневай каменцы, або ў пячы, на вогнішчы, ператвара**ецца** спачатку ў "жарству", а потым, паступова драбнеючы, злучаецца з зямлёй - сваёй першапачатковай крыніцай» [17, с. 210]) гладышы павінны былі паслугаваць яму магічным «трэнажорам». Па заканчэнні сеансу лекавання падрыву на пуп клалі камень: «Ну там не пудовы камешак такой. Ну ўсё раўно, штоб ён трохі ўдаўліваў пупок» (запісана аўтарам сумесна з У.А. Лобачам у 2003 г. ад В.Р. Шулкінай, 1944 г.н., у в. Заенкі, Полацкага р-на).

Апроч чыста механічнага тым самым аказвалася і магічнае ўздзеяння на хворае месца: залатнік меўся стаць на месца, каб «жываток анямеў і ніколі не балеў» [10, с. 233].

Безумоўна, нельга ні ў якім разе казаць пра падзвінскую выключнасць уяўленняў пра лекавыя здольнасці каменёў. Тым не менш з рухам на поўдзень Беларусі значэнне іх для народнай медыцыны паступова змяншаецца. Па звестках жа вядомай украінскай даследчыцы З. Балтаровіч выкарыстанне яго ў рамках украінскай народнай медыцыны пераважна абмяжоўваецца «громовыми стрілкамй», а геаграфічна - заходнімі прадгорнымі раёнамі [19, с. 263 - 264].

Паводле Э.М. Зайкоўскага і Л.У' Дучыц, на Падзвінні налічваецца некалькі дзесяткаў культавых крыніц, прыкметна больш, чым у іншых рэгіёнах [20, с. 102 - 103]. Вада амаль усіх крыніц - гаючая. Выдатную рэпутацыю маюць крыніцы ля Браслава (Шальціня-Зімнік), ля вёсак Чарневічы і Бабруйшчына (Глыбоцкі р-н), Сарочына і Стайкі (Ушацкі р-н) [20, с. 16, 35, 44] і многія іншыя. Згодна народным уяўленням, вада большасці крыніцаў дапамагае ад усіх хваробаў, але найболын - ад хваробаў вачэй. Некаторыя, (ужо) не вядомыя ў якасці сакральных аб'ектаў, таксама здаўна славяцца сваімі гаючымі ўласцівасцямі, напрыклад, крыніца ва ўрочышчы Баркоўшчына (Ушацкі р-н) [21]. Прычым апошняя разам з некаторымі іншымі (каля Відзаў на Браслаўшчыне, у Сянно, у езуіцкім фальварку Спас ля Полацка) здолела набыць санаторнае значэнне яшчэ ў XIX ст. [20, с. 55 - 56] Крынічная вада - надзвычай папулярны сродак і ў знахарскай практыцы.

Трэба заўважыць, што на Падзвінні няма гаючых крыніцаў (як, напрыклад, Палыкавіцкая ля Магілёва), чыя слава сягала б за яго межы [20, с. 38 - 39]. Але паколькі «святая крыніца, з'яўляючыся сакральным цэнтрам «свайго свету», гэта значыць бліжэйшых ваколіцаў з некалькімі паседішчамі, ужо можа быць не вядомай для «свету не блізкага», які адлягае пры гэтым не больш чым на 20 - 30 кіламетраў» [22, с. 68], у багатым на крыніцы рэгіёне кожны «свой свет» мае *сваю* культавую крыніцу. (Падобную акалічнасць можна адзначыць і адносна зрабіць святых камянёў-гойбітаў).

Вядомыя лекавымі ўласцівасцямі сваёй вады і многія азёры Падзвіння, напрыклад, в. Святое (ля в. Стралкі, Верхнядзвінскага р-на) і Лешава (Ушацкі р-н) [22, с. 72]. Значная гушчыня рачной сеткі аблягчала задачу знахараў, якія, па звестках А. Шлюбскага, пераважна карысталіся вадой, узятай з сутокаў рэк [23, с. 23]. Невыпадковасць гэтай практыкі тлумачыцца семантычным падабенствам сутокаў з ростанямі, а таксама «вынікае з архаічных уяўленняў пра існаванне крыніц з "жывой" і "мёртвай" вадой... спалучэнне і выкарыстанне якой у лекавых мэтах прыводзіла да "смерці" хворага і "нараджэння" новага чалавека» [22, с. 65 - 66].

Шматлікія водныя аб'екты забяспечвалі беларусаў Падзвіння якаснай пітной вадой, а ў цёплую пару года - больш прыдатнымі санітарна-гігіенічнымі ўмовамі. Дзякуючы багаццю рыбы і вадаплаўнай птушкі рэкі і азёры станоўча ўплывапі на характар харчавання насельніцтва.

Але вада з'яўляецца не толькі жыццядайным элементам, але й стыхіяй першароднага хаосу, а таму нясе патэнцыяльную пагрозу. Наибольшую небяспеку стваралі балоты - «улюбёныя месцы бытавання розных нячысцікаў» [24, с. 41]. Але локусам паходжання ліхаманкі падзвінскія беларусы называюць таксама і раку, возера, і нават сажалку. Менавіта туды кідаліся ахвяры 77 Ірадавым дочкам. А ў першыя 12 дзён пасля выздараўлення ачунялы чалавек не павінен быў доўга глядзець у ваду [17, с. 274, 277, 278]. Падобная перасцярога адрасавалася і цяжарнай жанчыне, будучае дзіця якой магло нарадзіцца касавокім [17, с. 3]. Асаблівую пагрозу водная стыхія несла ў пераломныя моманты гадавога і сутачнага цыклаў. Яна станавілася месцам канцэнтрацыі нячыстай сілы. Напрыклад, па звестках А. Шлюбскага: «У Полацкім павеце існуюць забабоны, што ў купальскую ноч памёрлыя калдуны ўстаюць і бягуць мыцца ў возера» [23, с. 23]. Таму магло патрабавацца ажыццяўленне засцерагальных рытуалаў, як гэта рабілася (і робіцца), напрыклад, на Вадохрышча.

Вялікае значэнне, якое надавалася ў народным уяўленні «гары» тлумачыцца тым, што яе вяршыня, «кропка найбольш набліжаная да неба... выступав як месца шчыльнай, эфектыўнай камунікацыі чалавека са светам багоў (Бога)» [22, с. 55]. Таму «узыходжане чалавека на тару і, адпаведна, набліжэнне яго да скральнай сферы, сустрэча з яе прадстаўнікамі - шырока распаўсюджана ў беларускіх замовах, яно дазваляе з большай верагоднасцю пазбавіца хваробы, чараў і г.д.» [22, с. 56].

Часта падзвінскія «горы» разам з каменямі і/або крыніцамі фарміруюць цэлыя сакральныя комплексы. У беларускім казачным фальклоры народ бачыць гэткае ідэальнае для лекавання месца наступным чынам: «От узнясла пчолка Каваля на высачэнную гару, спусцілася на землю да й паказвае на крыніцу. Зірне каваль аж з гары з-пад каменя жывая вада от так і свішча ўверх, бы з дудкі» [25, с. 315]. Рэальным, няхай нават і не зусім аўтэнтычным увасабленнем падобнага ідэалу, можа быць святая крыніца з гаючай вадой пад тарой Верхняга замка ў Полацку, дзе зараз яшчэ знаходзіцца і Барысаў камень. (Згодна ж меркаванню знаўцы Падзвіння У.А. Лобача, выказанаму ў прыватнай размове з аўтарам, размешчаны паблізу названай крыніцы безыменны камень - не што іншае як старадаўні ахвярнік). Паказальна, што ўяўленні пра сакральны характар і лекавыя ўласцівасці названай крыніцы дагэтуль яшчэ захоўваюцца на перыферыі «свайго свету», цэнтрам якога з'яўляўся Полацк (запісана аўтарам сумесна з У.А. Лобачам і Я.Л. Навічонкам ад С.Н. Адамовіч , 1923 г.н., у в. Лукаўцы, Полацкага р-на).

Каля Віцебска пад Юр'евай тарой знаходзіцца святая Юр'ева крыніца, вада якой дапамагае ад хвароб вачэй [20, с. 33]. Сакральныя комплексы, што адыгрывалі прыкметную ролю ў сістэме народнай медыцыны, дзейнічалі ля в. Стралкі Верхнядзвінскага р-на (тара - крыніца - возера), г. Сянно (тара - крыніца) і ў многіх іншых месцах рэгіёну [20, с. 28,33,34].

Падзвінне таксама вызначаецца адметнасцю сферы культуры (яна таксама частка знешняга асяроддзя сістэмы народнай медыцыны). У прыватнасці, рэгіён адносіцца да зоны распаўсюджання лазні [26, с. 282].

Ва ўяўленнях носьбітаў традыцыйнай культуры лазні адводзіцца памежнае становішча паміж патэнцыйна варожым чалавеку светам прыроды і светам культуры. Зона, да якой належыць лазня (як і мяжа ў полі, ростані, іншыя нежылыя пабудовы сялібы і г.д.), аптымальная для кантактаў з іншасветам і яго агентамі. А таму яна ёсць «локус для рытулаў пераходнага характару» [27, с. 278 ], найлепшае месца для ажыццяўлення магічных дзеянняў, і ў тым ліку аздараўленчых і лекавальных. Тым больш, што ў арсенале лазні - дапамога гэткіх магутных стыхій, як вада, зямля і агонь.

Лазня з'яўляецца выдатным сродкам захавання і ўмацавання здароўя. Па-першае, яна выконвае санітарна-гігіенічныя функцыі. «Ідзі-тка ж памыйцесь у лазні, а то вы падарожныя людзі, можа нечысць якая забралася!», - гаворыць казачны цар Сівавай Івану Сучкінаму сыну [23, с. 61]. Па-другое, лазня мае магутны ачышчальны эфект не толькі ў прамым сэнсе. Чароўны конь раіць царэвічу Івану Іванавічу: «Ідзі ў лазню, грахі змывай! Пацей крэпка ў духу!» [23, с. 480]. Чыста механічнае змыванне грахоў вадой (параўнай з хрышчэннем) і ўздзеянне п£ры (выніку ўзаемадзеяння воднай і вогненай стыхій) ужо самі па сабе ўяўляюцца сцаленнем. На «кымянкў» ажыццяўляецца расправа над паразітамі, што жывуць у бялізне, а ў «першым духў» знішчаюцца насякомыя, што жывуць у валасах [28, с. 296, 298].

1 хоць нельга прынцыпова аспрэчыць выказванне балгарскага этнографа Д. Марынава, маўляў, селянін паўсюль не любіць мыцца [29, с. 211], у параўнанні з палешуком, які «ледзьве ніколі не мыецца, а пра тое здароў», а калі і робіць тэта, дык «толькі таму, што не ўмыўшыся грэх спыжываць хлеб» [30, с. 86], і жыхарамі іншых рэгіёнаў, дзе не было лазні, беларус Падзвіння знаходзіўся ў значна лепшых умовах.

Па апісаннях Віцебскага павету інфарматаркі В.П. Шэйна А.Ф. Лісоўскай: «Нідзе ў нашых беларускіх вёсках няма грамадскай лазні, але ўсялякі гаспадар, калі толькі ён чалавек заможны, будуе сабе сваю...» [15, с. 5 - 6]. Яшчэ больш катэгарычна выказваецца наконт вельмі шырокага яе распаўсюджання ў Падзвінні Н.Я. Нікіфароўскі: «"Лазінка" разлічана на сямейныя патрэбы, дзеля чаго яна маецца амаль пры кожнай сямейнай сядзібе» [28, с. 288]. Уся сям'я кожную суботу (спачатку мужчыны, а гіотым жанчыны) мылася [31, с. 98]. Не дзіўна, што этнографы лічылі падзвінскіх беларусаў чысцёхамі [15, с. 9]. «Магчымага па дзіцячых сілах парэння венікам не пазбягалі й дзеці, нават грудныя» [28, с. 297]. Увогуле, выкарыстанне веніка - «паранне», неад'емны атрыбут мыцця ў лазні, сучасныя даследчыкі параўноўваюць з тэхналогіяй кавальства [27, с. 278]. «...Для архаічных грамадстваў жыццё не можа быць *выпраўлена*, яно можа быць толькі створана наноў.,.» [32, с. 40] і «лазенны каваль» быў здольны на тэта.

На Панямонні, дзе лазняў не было, грунтоўна мыліся ў печы толькі тады, «калі на каго з членаў сямейства нападае кароста (часотка)» [15, с. 66]. На Палессі, па сведчанні Ч. Пяткевіча, старанна пільнавалася чысціня толькі маленькіх дзетак. Мужчыны, наадварот, вызначаліся скрайняй неахайнасцю, бо мылі галаву толькі тады, калі завядзецца «дужа вошай» [30, с. 87].

Вельмі паказальна, на наш погляд, тое, што ў томе «Замовы» з серыі БНТ не прыводзіцца аніводнага тэксту ад каўтуна з Падзвіння (і большай часткі Падняпроўя) [14, с. 244 - 247]. Сучасныя палявыя даследаванні паказваюць, што нямногія са старажылаў могуць прыгадаць, што такое «калдун» (каўтун). 1 хоць будзе яўным перабольшваннем сцвярджаць пра адсутнасць у Падзвінні хваробы ў мінулым, можна меркаваць, што толькі спарадычныя ўзгадкі аб ёй носьбітамі традыцыйнай культуры тлумачацца і лепшымі санітарна-гігіенічнымі ўмовамі.

У лазні ажыццяўлялася дыягностыка хвароб. Каб вызначыць мужчына або жанчына сурочыла дзіця, выкарыстоўваліся камяні з лазеннай печы: «Калі болей за іншыя шыпіць верхні камень, дзіця "асурочана" мужчынам, ніжні - жанчынаю. Шыпенне "сірыдовага" каменя паказвае толькі, што "асурочыўшы" дзіця чалавек з мізэрнымі разумовымі здольнасцямі» [17, с. 34]. Лазня дапамагае на ранніх стадыях хваробы: «Як толькі ў каго-небудзь пачало балець у спіне, грудзях, баках і жываце, трэба «кідаць гаршкі» (ставіць банькі)» [17, с. 260]. Там лекавалі, «калі кішкі пераверну цца», ад «агнявой трасцы», рожы [13, с. 163, 168, 186], «нутраных хваробаў» [17, с. 130], падачас парання замаўлялі залатнік (доннік) [10, с. 505] ды інш. Нават сучасныя этнаграфічныя запісы яшчэ фіксуюць шматлікія прыклады лекавання ў лазні падрыву: «У бане мыесся - цярэць, цярэць... А тады бярэць венік гэты, каторы паруцца... бярозавы і так у пуп ставіць камлём і во так трошкі во пакруціць і дзержыць, і дзержыць» (запісана аўтарам сумесна з У.А. Лобачам і Я.Л. Навічонкам у 2003 г. ад Е.А. Вярыга, 1927 г.н., у в. Лукаўцы, Полацкага р-на).

Па звестках Н.Я. Нікіфароўскага, «нават заўжды мяккая падпадлогавая зямля гатовая на лекавыя патрэбы» - пры змешванні яе з мылам і попелам атрымлівалі мазь, якую прыкладвалі да прыпухлага ад вывіху месца [28, с. 292].

Таксама як задзейнічанне дабратворнага ўплыву на хворага стыхіі зямлі, можна разглядаць выкарыстанне ў лазні камянёў (гл. вышэй).

У прыведзеных прыкладах перадусім задзейнічаны вада, цяпло або зямля. Але ў многіх выпадках лазня ўжо сама па сабе, без іншых сродкаў уздзеяння мела значны эфект. Пры пякотцы цяжарнай жанчыне раілі «пайсці ў лазню цішком і там заклаўшы рукі назад, пракаўтнуць тры разы вады з якой-небудзь пасудзіны» [14, с. 159]. Ад дзіцячага «скулля» прыкладвалі мох, зняты з любой старой страхі, лазні ці якой іншай нежылой пабудовы [17, с. 45]. Ад «пархоў і шолудзяў» мылі галаву лугам, прыгатаваным з попелу ад сямі лазняў [17, с. 265].

Лазня таксама часта абіралася месцам, дзе адбываліся роды [18, с. 89, 105]. Этнографы XIX - пачатку XX ст. тлумачылі гэта тым, што ў хаце бракавала месца і маглі знаходзіцца «пабочныя» асобы [28, с. 300]. Нельга выключаць таго, што й самі вяскоўцы ўжо ўспрымалі логіку традыцыі менавіта такім чынам. Аднак за гэтымі познімі, ужо яўна здэградаванымі ўяўленнямі, нельга не бачыць больш архаічны змест. У якасці локусу для рытуалаў пераходнага характару лазня ідэальна падыходзіць для «пераходу-пераводу “на белы свет” новай (магчыма, рэінкарнаванай) душы» [33, с. 248].

З іншага боку, з прычыны свайго памежнага статусу, і таму амбівалентнасці, лазня можа несці пагрозу здароўю і жыццю чалавека. Першая небяспека - тэмпаральная, а адсюль і тэрмальная, «перадазіроўка». Менавіта такім чынам казачныя героі (антыгероі) зводзяць рахункі з ворагамі. Другая - пагроза звычайных хвароб, якія актывізуюцца ў целе чалавека і перадаюцца іншым. Там, напрыклад, можна падхапіць «наход», калі цела пакрываецца болькамі і гніе. Гэтая хвароба чапляецца, калі жанчына, у якой месячныя, убачыць у лазні голага чалавека [17, с. 86]. Але патэнцыйная небяспечнасць асяроддзя спрыяе «запаленню» не толькі «скулак», але таксама іншых скураных хваробаў і нават звычайнага насмарку. Дзеля недапушчэння распаўсюджвання немачы хвораму прадпісвалася выконваць шэраг засцерагальных працэдур [17, с. 258, 260]. Пасля апоўначы, калі лімінальная зона станавілася полем адкрытай дзейнасці дэструктыўных сілаў, пагроза здароўю і жыццю чалавека дасягала свайго апагея [34, с. 44]. «Калі лазня размяшчалася на мяжы (гэтак часцей за ўсё і было), небяспека яшчэ больш узрастала» (запісана аўгарам сумесна з У.А. Лобачам у 2004 г. ад Н.У. Голубевай, 1925 г.н., у в. Непароты, Шумілінскага р-на).

Нягледзячы на тое, што праведзены аналіз уплыву знешняга асяроддзя на народную медыцыну беларусаў Падзвіння носіць папярэдні характар і не можа прэтэндаваць на вычарпальнасць, ужо яго вынікі дазваляюць зрабіць наступныя высновы:

1. Ландшафтныя характарыстыкі рэгіёну - шматлікія ўзвышшы, валуны, водныя аб’екты - і шырокае бытаванне лазні прадвызначаюць шэраг асаблівасцей народнай медыцыны беларусаў Падзвіння: адметнасць уяўленняў аб прафілактыцы, дыягностыцы ды этыялогіі хваробаў, лекавых сродках і прыёмах, а таксама спецыфіцы практычнай дзейнасці, скіраванай на захаванне і ўмацаванне здароўя людзей, папярэджанне, выяўленне і лячэнне хвароб.

2. Комплекс названых асаблівасцей дазваляе казаць пра народную медыцыну беларусаў Падзвіння як пра асобную сістэму ў рамках сістэмы беларускай народнай медыцыны.

## ЛІТАРАТУРА


I. Урманцев Ю.А. Природа адаптации (системная экспликация) // Вопросы философии. - 1998. - № 12. - С. 21 -36.
2. Бромлей Ю.В. Очерки теории этноса. - М.: Наука, 1983.-412 с.
3. Мацвееў А.В. Рэльеф і геамарфалогія // Нацыянальны атлас Беларусь - Мн., 2002. - С. 62.
4. Нацыянальны атлас Бе%русі. - Мн., 2002. - 292 с.
5. Цітоў В.С. Этнаграфічная спадчына. Беларусь. Краіна і людзі: Вучэб.-метад. дапам. - Мн.: Беларусь, 1996.-208 с.
6. Ляўкоў Э.А. Маўклівыя сведкі мінуўшчыны. - Мн.: Навука і тэхніка, 1992. - 215 с.
7. Грыневіч Г.Г. Паверхневыя воды // Нацыянальны атлас Беларусь - Мн., 2002. - С. 84
8. Лобач У.А. Уяўленні аб прасторы і часе ў традыцыйным светапоглядзе беларусаў (па этнаграфічных і фальклорных матэрыялах XIX - пач. XX ст.): Аўтарэф. дыс. ... канд. гіст. навук. - Мн., 2003. - 19 с.
9. Дучыц Л., Зайкоўскі Э., Лобач У. Камень // Беларуская міфалогія: Энцыклапед. слоўнік / С. Санько, Т. Валодзіна, У. Васілевіч і інш. Мн.: Беларусь, 2004. - С. 221 - 222.
10. Замовы / Уклад., сістэм. тэкстаў, уступ арт. і камент. Г.А. Барташэвіч; Рэдкал. А.С. Фядосік (гал. рэд.) і інш. - Мн.: Навука, 1992. - 597 с.
II. Драздовіч Я. Дзённік//Маладосць. - 1991. -№ 10. -С. НО- 125.
12. Лобач У.А. Да вынікаў археалагічна-этнаграфічнай экспедыцыі ў мястэчку Бачэйкава і яго ваколіцах // Матэрыялы II Міжнар. канф. па праблемах музеефікацыі унікальных гістарычных тэрыторый. - Полацк: Спадчына Ф. Скарыны, 1996. - С. 45 - 48.

13. Дучыц Л.У. Археалагічныя помнікі ў назвах, вераваннях і паданиях беларусаў / Пад рэд. М.А. Ткачова. - Мн.: Навука і тэхніка, 1993. - 59 с.
14. Werénko F. Przyczynek do lecznictwa ludowego // Materjaly antropologiczno-archeologiczne i etnograficzne. - Kraków: Wyd-wo Komisyi Antropolog . Akad. Umi^tnosci', 1896. - T. 1. - S. 99 - 228.
15. Шейн П.В. Материалы для изучения быта и языка русского населения Северо-Западного края. - СПб.: Тип. Имп. Акад. Наук, 1902. Т. Ш. - 518 с.
16. Лобач У. Парог // Беларуская міфалогія: Энцыклапед. слоўнік / С. Санько, Т. Валодзіна, У. Васілевіч і інш. - Мн.: Беларусь, 2004. - С. 366 -367.
17. Никифоровский Н.Я. Простонародные приметы и поверья, суеверные обряды и обычаи, легендарные сказания о лицах и местах Витебской Белоруссии. - Витебск: Губерн. типолитография, 1897. - 307 с.
18. Радзіны: Абрад. песні / Уклад, і сістэм. тэкстаў, уступ арт. і камент. Г.А. Пятроўскай, апісанне абрадаў Т.І. Кухаронак; Рэдкал.: А.С. Фядосік і інш. - Мн.: Беларуская навука, 1998. - 637 с.
19. Болтарович 3. Укра'шська народна медицина: Історія і практика. - Кшв: Абрис, 1994. - 320 с.
20. Зайкоўскі Э.М. Жыватворныя крыніцы Беларусі / Э.М. Зайкоўскі, Л.У. Дучыц. - Мн.: Ураджай, 2001.- 111 с.
21. Дединкина С. Целебный родник Барковщина // Народнае слова. - 2003. - 18 сакавіка.
22. Лобач У.А. Уяўленні аб пpaстoры і часе ў традыцыйным светапоглядзе беларусаў (па этнаграфічных и фальклорных матэрыялах XIX - пач. XX ст.): Аўтарэф. дыс.... канд. гіст. навук. - Мн., 2003. - 38 с.
23. Шлюбскі А. Матар’ялы для вывучэння фальклору і мовы Віцебшчыны. - Мн.: Коштам 1н-ту бел. к-ры, 1927. - Ч. 1.-262 с.
24. Дучыц Л., Лобач У., Санько С. Балота // Беларуская міфалогія: Энцыклапед. слоўнік / С. Санько, Т. Валодзіна, У. Васілевіч і інш. - Мн.: Беларусь, 2004. - С. 41 - 42.
25. Чарадзейныя казкі: У 2 ч. Ч. 1 7 НАН Беларусі, ін-т масгацвазнаўства, этнаграфіі і фальклору; Склад. К.П. Кабашнікаў, Г.А. Барташэвіч; Рэд. выд. В.К. Бандарчык. - 2-е выд., выпр. і дапрац. - Мн.: Бел. навука, 2003. - 639 с.
26. Беларусы: У 8 т. Т. 2: Дойлідства / А.І. Лакотка; Ін-т мастацвазнаўства, этнаграфіі і фальклору; Рэдкал.: В.К. Бандарчык, М.Ф. Піліпенка, АЛ. Лакотка. - Мн.: Тэхналогія, 1997. - 391 с.
27. Валодзіна Т. Лазня // Беларуская міфалогія: Энцыклапед. слоўнік / С. Санько, Т. Валодзіна, У. Васілевіч і інш. - Мн.: Беларусь, 2004. - С. 278 - 279.
28. Никифоровский Н.Я. Очерки простонародного житья-бытья в Витебской Белоруссии и описание предметов обихода. - Витебск: Губерн. типолитография, 1895. -465 с.
29. Нидерле Л. Славянские древности / Пер. с чешек. Т Ковалевой, М. Хазанова Т.; Ред. А.Л. Монгайта. - М.: Алетейа, 2000. - 592 с.
30. Pietkiewicz Cz. Kultura duchowa Polesia Rzeczyckiego. Materjaly etnograficzne. - Warszawa: Tow-wo naukowe Warszawskie, 1938. - 495 s.
31. Беларусы: У 8 т. Т. 5. Сям’я / В.К. Бандарчык, Г.М. Курыловіч, Т.1. Кухаронак і інш.; Рэдкал.: В.К. Бандарчык і інш.; Ін-т мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору НАН Беларусь - Мн.: Беларуская навука, 2001.-375 с.
32. Элиаде М. Аспекты мифа. - М.: Инвест-ППП, СТ ППП, 1995. - 240 с.
33. Валодзіна Т.В. Дыхатамія «свой-чужы» ў сферы ўяўленняў наіўнай антрапалогіі // Мовазнаўства. Літаратура. Культуралогія. Фальклstatic: XIII Міжнар. з’езд славістаў (Любляна, 2003). Даклады беларускай дэлегацыі (Асобны адбітак). - Мн.: Беларуская навука, 2003. - С. 246 - 261.
34. Никифоровский Н.Я. Нечистики, свод простонародных в Витебской Белоруссии сказаний о нечистой силе. - Витебск: Изд-во Н.А. Паньков, 1995. - 88 с.